# УВОДЗІНЫ

У ліпені 2023 года споўнілася 79 гадоў з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А наступны год - юбілейны.

Гады ідуць, дзеяцігоддзі…А памяць так і не дае забыць.

У гераічны летапіс Вялікай Айчыннай вайны яркую старонку ўпісалі працоўныя Гродзеншчыны, якія падняліся разам з усім савецкім народам на святую барацьбу супраць гітлераўскіх полчышчаў. Савецкія памежнікі, воіны Чырвонай Арміі з першых хвілін вайны вялі цяжкія, няроўныя бai з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка пад частымі налётамі варожай авіяцыі. Нашы войскі неслі вялікія страты. У абарончых баях на тэрыторыі Беластоцкай і Баранавіцкай абласцей загінулі тысячы камандзіраў і чырвонаармейцаў, многія параненыя і кантужаныя, патрапілі ў палон. Яны сваімі грудзьмі прыкрывалі Радзіму ад карычневай фашысцкай чумы. Ужо ў першыя месяцы варожай акупацыі, нягледзячы на жорсткі тэрор, на тэрыторыі цяперашняй Гродзенскай вобласці з'яўляюцца партызанскія групы, падпольныя партыйна-камсамольскія і антыфашысцкія арганізацыі.

Для маладога пакалення XXI стагоддзя Вялікая Айчынная вайна – гераічная і незабыўная старонка гісторыі – жыве ў мастацкіх і дакументальных кінастужках, літаратурных творах, песнях, мемуарах і музейных экспазіцыях... Але самыя галоўныя сведкі той легендарнай старонкі гісторыі нашай краіны – ветэраны, удзельнікі той страшнай вайны.

На адной з экспазіцый краязнаўчага музея Лукскай СШ – фотаздымкі і ўспаміны ветэранаў, нашых аднавяскоўцаў. Побач – маўклівыя ваенныя рэліквіі: пісьмы з фронту, пахаронкі, ваенны білет ветэрана, рэшткі зброі, нямецкая і руская каскі, а яшчэ запісная кніжка і салдацкая лыжка. Два апошнія экспанаты даражэй мне, чым астатнія: запісная кніжка належыць быламу настаўніку нашай школы Тананка Івану Ануфрыевічу, а салдацкая лыжка майму аднавяскоўцу Уладзіміру Лаўрэнцьевічу Анікій, які таксама быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Таму мне захацелася правесці даследаванне і даведацца аб гісторыі гэтых экспанатаў, якія б “расказалі” нам

аб невядомых старонках ваеннай біяграфіі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. А раскрываць гэтыя невядомыя старонкі – гэта заўсёды актуальная задача, а на сённяшні дзень - тым больш.

Мэта нашага даследавання – пазнаёміцца з гісторыяй музейных экспанатаў і выявіць невядомыя старонкі ваеннай біяграфіі ветэранаў. Перад сабой мы паставілі задачы:

- апісаць асабістыя рэчы ветэранаў - сведкаў ваенных падзей;
- вывучыць невядомыя старонкі гераічнага мінулага малой Радзімы, баявыя подзвігі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Мы выдзвінулі гіпотэзу, што гісторыя асабістых рэчаў ветэранаў непасрэдна звязана з гісторыяй іх ваеннага жыцця.

Такім чынам, аб'ект нашага даследавання – невядомыя старонкі ваеннай біяграфіі ветэранаў – нашых землякоў.

Прадмет даследавання – гісторыя музейных экспанатаў.

У сваім даследаванні мы абапіраліся на матэрыялы школьнага краязнаўчага музея, успаміны дзяцей ветэранаў, архіўныя звесткі, публікацыі ў "Гродзенскай праўдзе" і раённай газеце "Полымя".

З дапамогай архіўных матэрыялаў, публікацый з газет мы даведаліся аб абарончых баях на тэрыторыі вобласці ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, аб акупацыі вобласці і раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі, арганізацыі партызанскага руху на захопленых тэрыторыях, якія былі звязаны з лёсам маіх землякоў – Уладзіміра Лаўрэнцьевіча Анікій і былога школьнага настаўніка Тананка Івана Ануфрыевіча.

## ГЛАВА 1. ГАРАДЗЕНШЧЫНА Ў ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ

22 чэрвеня 1941 г. разбойніцкі напад гітлераўскай Германіі перапыніў мірную стваральную працу савецкага народа. Наша краіна ўступіла ў смяротную сутычку з нямецкім фашызмам. Нямала прыкладаў самаахвярнасці і стойкасці савецкіх воінаў, якія стаялі да смерці на шляху ворага, далі і абарончыя баі ў чэрвені 1941 года на тэрыторыі Гродзеншчыны. Вораг разлічваў ўжо першымі ўдарамі знішчыць савецкія войскі і ў далейшым хутка прасунуцца на ўсход у агульным кірунку на Ліду, Наваградак, Карэлічы, Мір, Баранавічы. Але гэтыя планы нямецкага камандавання былі сарваныя самаадданымі дзеяннямі злучэнняў і частак 3-й арміі. Насуперак разлікаў ворага баі ў раёне Гродна набылі зацяжны характар і працягваліся да 26 чэрвеня 1941 года. Жорсткія баі ў сярэдзіне дня 22 чэрвеня разгарнуліся на рубяжы Рацічы-Канюхі на паўночны захад ад Гродна. Паветраны таран здзейсніў у гэты дзень камандзір эскадрыллі 16-га скараснога бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка капітан А.С.Пратасаў. [5, с.154]. Баі ў раёне Гродна працягваліся і пасля астаўлення горада савецкімі войскамі ў ноч на 23 чэрвеня.

24-27 чэрвеня зацятыя баі ішлі ў раёне Ліды. Каля 60 адзінак бронетэхнікі страціў тут вораг. На працягу 24 і 25 чэрвеня, адбіваючы атакі 17-й і 18-й танкавых дывізій праціўніка 2-й танкавай групы генерала Г. Гудэрыяна, ўтрымлівалі мяжу на р. Шчара ў раёне Слоніма 155-я і 121-я стралковыя дывізіі 4-й арміі. Ўстойлівая абарона ў раёне Слоніма прымусіла Гудэрыяна падцягнуць сюды дадаткова 29-ю матарызаваную дывізію. [5, с.161]. Гэта яшчэ больш пагоршыла становішча нашых войскаў, і яны з баямі пачалі адыходзіць да Наваградка, Карэліч, Міра і Баранавіч. Мужнасць і самаадданасць савецкіх воінаў, стойкасць многіх частак і падраздзяленняў Заходняга фронту зніжалі наступальныя магчымасці ворага, наносілі яму адчувальны ўрон.

Але, валодаючы перавагай ў сілах, нямецкія войскі азвярэла рваліся наперад. 23 чэрвеня яны захапілі Гродна і Воранава, 25 чэрвеня - Ашмяны,

Слонім, Смаргонь, 26 чэрвеня - Масты, Свіслач, Шчучын, 27 чэрвеня - Ліду, Астравец, 28 чэрвеня - Зэльву, Ваўкавыск, 29 чэрвеня - Вялікую Бераставіцу, Дзятлава, Іўе, 2 ліпеня - Навагрудак, Карэлічы, Мір. Да канца першай дэкады вайны тэрыторыя Гродзеншчыны была цалкам акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. [5, с.164].

Захапіўшы Гарадзеншчыну, гітлераўцы, як і паўсюдна на акупіраванай савецкай тэрыторыі, ўсталявалі тут рэжым крывавага тэрору, жахлівага самавольства і рабавання. Вялікая яе частка была ўключана ў генеральную акругу «Беларусь», заходнія раёны ўвайшлі ў склад асаблівай акругі «Беласток, а паўночныя - у склад генеральнай акругі «Літва». Выкарыстоўваючы разгалінаваны і шматлікі ваенна-паліцэйскі апарат рэпрэсій і падаўлення, гітлераўскія каты ажыццяўлялі палітыку генацыду ў дачыненні да савецкіх людзей. З асаблівай жорсткасцю акупанты распраўляліся з камуністамі, камсамольцамі, савецкімі актывістамі. За тры гады акупацыі гітлераўскімі катамі было забіта і закатавана на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна - 29332, Лідскага - 25148, Навагрудскага і Мірскага - 45065, Слонімскага - 42 тысячы савецкіх грамадзян. [5, с.178]. Дзясяткі тысяч чалавек пад страхам смерці сагнаны на катаржныя работы ў Германію. Крывавым тэрорам і нечуванымі зверствамі фашысты спрабавалі запалохаць беларусаў, задушыць іх волю да супраціўлення. Але ўсё гэта аказалася беспаспяховым перад сілай патрыятызму і адзінства нашага народа.

# ГЛАВА 2. ПАДПОЛЬНАЯ І ПАРТЫЗАНСКАЯ БАРАЦЬБА СУПРАЦЬ АКУПАНТАЎ

Ужо ў першыя тыдні фашысцкай акупацыі на Гарадзеншчыне сталі ўзнікаць ачагі супраціўлення захопнікам. Разгортвалася барацьба падпольшчыкаў у розных гарадах і пасёлках Гродзенскай вобласці. Актыўна ішоў працэс ўзнікнення падпольных камсамольскіх арганізацый. У ліпені - верасні 1941 г. падпольныя групы ўзніклі ў вёсцы Дабраволя Свіслацкага раёна, у вёсках Нізяны і Паўлаўшчына Ваўкавыскага раёна, у Скідзельскім раёне, у вёсцы Явар Казлоўшчынскага раёна, у вёсцы Зачэпічы Дзятлаўскага раёна.

У чэрвені - ліпені 1941 года па ініцыятыве камсамольцаў Івана Мацко, Канстанціна Балабановіч, Уладзіміра Калесніка, Яўгена Крамко, Аляксандра Бянецкага ствараюцца падпольныя камсамольска-маладзёжныя арганізацыі ў вёсках Пагарэлка, Сіняўская Слабада, Беражное, Лядкі Мірскага раёна [4, с.3]. У верасні 1942 года былы член КПЗБ І.А. Капытко і камсамольцы С.Н.Брынкевіч, Н.І. Владэс абвясцілі сябе Навагрудскім падпольным райкамам камсамола. Актыўную падрыхтоўку ў разгортванні адкрытай узброенай барацьбы з акупантамі вяло камсамольска-маладзёжнае падполле ў Мірскім раёне. Падпольшчыкі збіралі зброю і боепрыпасы, усталявалі сувязь з дзейнічаючымі ў Налібоцкай пушчы партызанскімі групамі, ўзбройвалі іх, забяспечвалі харчаваннем, вялі для іх разведку. У ліпені-жніўні 1942г. падпольныя арганізацыі вёсак Беражнае, Лядкі, Сіняўская Слабада амаль у поўным складзе сышлі ў партызаны. Падпольшчыкі прымалі ўдзел у баявых аперацыях партызан па разгрому варожых гарнізонаў, разбурэнні ліній сувязі і іншых важных для акупантаў аб'ектаў.

З вясны 1942 года на Гарадзеншчыне пачынаецца хуткі рост партызанскага руху. У лютым-маі 1942 пачынаюць дзейнічаць партызанскія групы П.А. Аляксандрава, П.І.Булак, Б.А. Булата, У.І. Балабанава, І.Р. Еўдакімава, Н.С. Заруднева, А.І.Іванова, В.Ф. Кавязіна, П.К. Макарава, У.І. Панчанкава, А.І. Феакцістава і інш. [4, с.3].

Адбывалася аб'яднанне ў атрады асобна дзейнічаючых груп. У сакавіку 1942 г. у паўднёвай частцы Лідскага раёна на базе групы П.К. Макарава арганізаваўся партызанскі атрад Лідскі, а ў красавіку ў Слонімскім раёне з партызанскіх груп П.А. Аляксандрава і П.П.Федасеева ўтварыўся атрад 54-ы (пазней імя Ф.Э. Дзяржынскага), а ва ўсходняй частцы Дзятлаўскага раёна ў выніку аб'яднання груп У.І.Панчанкава і А.А. Рэдзька - атрад 96-ы (пазней «Кастрычніцкі»). У маі 1942 г. у заходняй частцы Дзятлаўскага раёна на аснове групы В.Ф. Кавязіна ствараецца партызанскі атрад Арлянскі (пазней «Барацьба»), у Карэліцкім раёне група Т.Д. Дзмітрыева афармляецца ў атрад імя М.В. Фрунзе. У чэрвені 1942 у Мірскім раёне арганізаваўся атрад імя У.І. Чапаева, а ў Карэліцкім - атрад Золатава (пазней ім. 1 Мая). У жніўні ў Мірскім раёне ўтварыўся атрад Д.А. Дзенісенкі, а ў верасні - атрад «Камсамольскі (пазней – брыгада «Камсамолец»), асноўную масу байцоў якога складалі камсамольцы-падпольшчыкі вёсак Беражнае, Пагарэлка, Сіняўская Слабада, Лукі, Асташын, Ярэмічы. [4, с.3].

Партызанскія атрады разгарнулі актыўную баявую дзейнасць. Налётамі на гарнізоны, органы кіравання і гаспадарчыя аб'екты акупантаў, дыверсіямі на чыгунках і шашэйных дарогах, лініях сувязі, раптоўнымі ўдарамі з засад яны наносілі адчувальныя страты ворагу. Атрад «Камсамольскі» (камандзір - А.С. Саяцевіч) да канца 1942 разграміў тры варожых гарнізона, пяць нямецкіх маёнткаў, знішчыў усе масты ў Мірскім раёне.

Партызанскі рух на Гродзеншчыне набываў усё больш масавы характар. Да канца 1942 тут дзейнічала 15 партызанскіх атрадаў і 4 партызанскія групы, якія налічваюць каля дзвюх тысяч чалавек. У поўнай меры ўсенародны характар барацьбы супраць гітлераўскіх акупантаў на Гродзеншчыне раскрыўся ў 1944 годзе. Да канца 1943 года на Гродзеншчыне ўзброеную барацьбу з акупантамі ўжо вялі 18 партызанскіх брыгад, якія аб'ядноўвалі 72 атрады і 8 асобна дзеючых атрадаў. Іх асабісты склад налічваў каля 10 тысяч байцоў. Шырокі характар насіў ўдзел партызан Гродзеншчыны ў аперацыях «Рэйкавая вайна» і «Канцэрт». У ноч з 21 на 22 сакавіка 1944 г.

брыгады «Камсамолец» (камандзір Г.М. Панявін) і імя Г.К. Жукава (камандзір Р.Л. Васілевіч) здзейснілі паспяховы напад на гарнізон у раённым цэнтры Мір. Партызаны спалілі 5 аўтамашын, забілі і паранілі каля 50 фашыстаў. Аналагічную аперацыю ў Мірскім раёне правёў атрад Д.А. Дзенісенкі, знішчыўшы 15 гітлераўцаў. [4, с.3]. Была праведзена вялікая масава-палітычная работа сярод насельніцтва. Напрыклад, у Дзятлаўскім і Казлоўшчынскім раёнах партызаны-агітатары правялі сходы і гутаркі з сялянамі 114 вёсак, у Карэліцкім і Навагрудскім раёнах - 92 вёсак. [1, с.2]. Актыўна выкарыстоўваўся падпольны друк.

Перамога ў вайне каштавала нямала чалавечых ахвяр. Загінулі мільёны савецкіх людзей. Многія сем'і пазбавіліся бацькоў, братоў, сыноў, унукаў. У брацкіх магілах Гродзенскай вобласці пахавана больш за 50 тысяч ваяроў, партызан і падпольшчыкаў. Загінула больш за 127 тысяч мірных грамадзян. І мы не можам, не маем права забываць тых, хто аддаў свае жыцці за вызваленне Радзімы.

## ГЛАВА 3. ГІСТОРЫЯ АДНОЙ РЭЛІКВІІ

Сярод маіх суседзяў і знаёмых няма ніводнай сям'і, якую б не закранула сваім чорным крылом вайна 1941 – 1945 г.г. Для нас гэта было вельмі даўно і зусім нядаўна для гісторыі.

Мой аднавясковец Уладзімір Лаўрэнцьевіч Анікій таксама быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Ён бацька настаўніцы нашай установы адукацыі Анікій Алены Уладзіміраўны. Некаторыя рэчы - рэліквіі, якія былі сведкамі той страшнай ваеннай пары, яна перадала ў школьны музей. Гэта і яго ўзнагароды, і дакументы, якія пацвярджаюць яго ваеннае мінулае, і рэчы, зробленыя асабіста сваімі рукамі. А я хачу расказаць вам пра … лыжку. Пра звычайную алюміневую лыжку, сталовы прыбор, без якога не абходзіцца ні адзін чалавек. Безумоўна, лыжка гэта не зусім звычайная. Па-першае, яна з'яўляецца сямейнай рэліквіяй, а па-другое, яна маўклівая сведка і нястомная

ўдзельніца ўсіх перажытых падзей, пройдзенных сваім гаспадаром ваенных шляхоў і дарог. Вось чаму сёння гэтая звычайна- незвычайная лыжка заняла пачэснае месца сярод экспанатаў нашага школьнага музея..

Лыжка гэта адметная ўжо тым, што мае даволі шаноўны ўзрост - недзе каля 90 гадоў, - а таму шмат чаго пабачыла на сваім вяку. І калі б яна магла гаварыць, то, напэўна, расказала б нам многа цікавага. Напрыклад, што з'явілася яна на свет недзе ў далёкія 30-я гады мінулага стагоддзя на адным з заводаў далёкай Аргенціны – на чаранку яе можна заўважыць штамп “Nunarg-Frase…”, а потым трапіла на іншы кантынент, у Польшчу. [ДАДАТАК 1].

А ў гэты час у беларускай вёсцы Лукі, якая разам з тэрыторыяй Заходняй Беларусі ўваходзіла ў склад панскай Польшчы, жыў у вялікай сялянскай сям'і Анікіх звычайны хлопец Уладзімір. Магчыма, пра тую Аргенціну ён нават і не чуў. Нарадзіўся ён у 1916 годзе і быў малодшым сынам у сям'і, таму ў сярэдзіне 30-х гадоў прызвалі яго на службу ў Войска Польскае (старэйшых сыноў на службу не забіралі). Трапіў Уладзімір у кавалерыю, у 2-гі Уланскі полк. І вось тут адбылася яго сустрэча з нашай гераіняй – лыжкай, якая да гэтага часу ўжо стала не звычайнай, а ведамаснай: на яе чаранку ў верхняй частцы горда красаваліся выгравіраваны польскі герб – арол – і літары “ W P San”, што, як мы мяркуем, азначае “Войска Польскае Святое” [ДАДАТАК 1].

Атрымаў Уладзімір гэту лыжку як частку сваёй вайсковай маёмасці, і стала яна яго вернай спадарожніцай на доўгія гады нялёгкага салдацкага і жыццёвага шляху. А што шмат кашы ён гэтай лыжкай пераеў, відаць па яе вонкавым выглядзе.

Калі б лыжка магла гаварыць, то распавяла б яна нам, як у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года Уладзімір Анікій разам з сябрамі-аднапалчанамі трапіў у савецкі палон, і збіраліся іх, як варожых элементаў, вывезці ў Сібір. Так і згінула б наша гераіня разам са сваім гаспадаром у сталінскіх лагерах, але лёс злітаваўся над беднымі хлопцамі: моцнага надзору за імі не было, і ўцяклі, хто мог, з-пад Баранавічаў па дамах.

Вярнуўся Уладзімір дадому ў Лукі і лыжку ў халяве бота прынёс з сабой. Стаў працаваць у калгасе, добра разбіраўся ў сельскагаспадарчай тэхніцы, таму і даверылі яму рамонтную брыгаду. Працаваць прыходзілася і ўдзень і ўначы, сілкавацца прама ў полі, таму і тут не абыходзіўся ён без сваёй лыжкі. Але нядоўга прыйшлося займацца Уладзіміру Лаўрэнцьевічу мірнай працай. У 1940-м годзе забралі яго ўжо на савецкія армейскія зборы ў Школу малодшых сяржантаў. У Чырвонай Арміі да так званых “заходнікаў” адносіны былі насцярожанымі, нават сялілі іх асобна ад рускіх.

Калі ж пачалася Вялікая Айчынная вайна, то Уладзімір, як падрыхтаваны чалавек, адразу ж быў прызваны на фронт. Зборы былі нядоўгімі, і, вядома, у рэчавым мяшку была, стаўшая ўжо такой прывычнай, знаёмая нам лыжка, бо салдат павінен заўсёды быць гатовым да бою і да абеду! Пакуль прызваныя хлопцы дабіраліся на зборны пункт, Баранавічы захапілі немцы, таму ўсе вярнуліся назад.

Тры гады прыйшлося сям’і пражыць у акупацыі. Кожны дзень пачынаўся з таго, што ніхто не ведаў, хто застанецца жывым да яго канца, а каго ўжо не стане. Страшная доля спасцігла сям’ю самага старэйшага брата Філіпа, які жыў у Новым Сяле: яго з жонкай і двума дзецьмі разам з яшчэ трыццацю жыхарамі вёскі фашысты спалілі ў вясковым хляве за сувязь з партызанамі.

Для Уладзіміра прыкладам сапраўднага героя ўзброенай барацьбы з ворагамі стаў яго брат Якаў, які адным з першых у вёсцы пайшоў у партызаны яшчэ ў 1942 годзе, быў памочнікам камандзіра ўзвода, узначальваў камсамольскую арганізацыю народных мсціўцаў. Уладзімір падтрымліваў з імі сувязь, дапамагаў партызанам харчамі, разам з сябрамі-аднавяскоўцамі збіраў звесткі аб размяшчэнні нямецкіх салдат, аб аперацыях, якія рыхтавалі паліцаі. За гэта аднойчы амаль не паплаціўся жыццём. Разам з сябрамі яны павінны былі завезці воз з сенам у вёску Асташын, каб перадаць потым партызанам. Па дарозе іх спаткалі немцы і паліцаі. Двух расстралялі, а Уладзіміра разам з яго аднавяскоўцам А.І.Мацко са звязанымі калючым дротам рукамі павезлі ў

Карэлічы, каб там вырашыць іх лёс. Аднак маладым людзям пашчасціла. Па лясной дарозе на павозкі напалі партызаны і адбілі іх у паліцаяў. [3, с.2]

Так з сакавіка 1944 года Уладзімір Лаўрэнцьевіч стаў членам партызанскага атрада імя Калініна брыгады “Камсамолец”. Аб гэтым сведчыць Пасведчанне партызана Беларусі № 041611, у якім адзначана, што Анікій Уладзімір Лаўрэнцьевіч сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі з 13 сакавіка 1944 года па 11 ліпеня 1944 года радавым партызанскага атрада імя Калініна брыгады “Камсамолец”. [ДАДАТАК 2].

Першы бой прыняў Уладзімір у Сіняўскай Слабадзе, калі выручалі з бяды мясцовых камсамольцаў. Паступова прыходзіў вопыт. Хутка сталі давяраць і больш складаныя заданні: быў залічаны ў групу падрыўнікоў - рвалі эшалоны ля станцыі Негарэлае. І тут, у партызанскай зямлянцы, разам была яго спадарожніца – лыжка.

Адразу пасля вызвалення Мінска ён і многія з яго сяброў-партызан служылі ў знішчальным батальёне: даводзілася лавіць немцаў пасля “мінскага катла”. Потым былі адпраўлены на фронт, але яго па стану здароў’я – адкрылася язва страўніка – камісавалі. І на гэтым гісторыя лыжкі магла б і закончыцца. А адбылося наступнае. Разам з Уладзімірам служыў у знішчальным батальёне яго зямляк з-пад Міра Мікалай. І калі той даведаўся, што Уладзіміра камісавалі, то папрасіў яго памяняцца кажухамі, бо ў Мікалая кажух быў амаль новы і ён шкадаваў, што той можа прапасці, а Уладзіміраў кажух быў стары, паношаны. Уладзімір на абмен пагадзіўся і ў дадатак аддаў земляку свой рэчавы мяшок (на вайне ўсё спатрэбіцца !) разам са знаёмай нам лыжкай. Калі ён вярнуўся дамоў, то вырашыў не пакідаць кажух сабе, а знайсці сям’ю Мікалая і аддаць вопратку жонцы: немаведама, ці вернецца яшчэ іх гаспадар жывым з фронту, а рэч амаль новая і сям’і спатрэбіцца. Як вырашыў, так і зрабіў.

Невядома, колькі яшчэ ваенных кіламетраў прайшла разам з Мікалаем наша лыжка. А ўдзельнічаў той у вызваленні Польшчы, Чэхаславакіі і дайшоў да Берліна, там і сустрэў Перамогу. А ўлетку 1945 года вярнулася “гераіня” да

свайго былога гаспадара. Пры сустрэчы ў якасці падзякі перадаў Мікалай Уладзіміру яго рэчы, якія захаваліся пасля ваеннага паходу, і кісет добрага тытуню. Дома знайшлі Уладзіміра Лаўрэнцьевіча і ваенныя ўзнагароды: ордэн Вялікай Айчыннай вайны і медаль “За баявыя заслугі”.

Пасля вайны давялося яшчэ нашай лыжцы ўдзельнічаць разам са сваім гаспадаром у будаўніцтве новага Мінска (1945 – 1946 год). У гэты час быў вялікі голад, таму Уладзімір вярнуўся ў Лукі, дзе і пражыў усё сваё жыццё. З 1954 года і да выхаду на пенсію працаваў у калгасе трактарыстам, неаднаразова атрымліваў Ганаровыя граматы за сваю добрасумленную працу. І далей выкарыстоўвалася лыжка па сваім прамым прызначэнні, а потым яе не выкінулі, а засталася яна ў сям’і Анікіх як рэліквія, як сімвал нялёгкага, багатага на падзеі жыцця.

Цяпер гэта лыжка займае ганаровае месца ў экспазіцыі нашага школьнага музея.

Я спадзяюся, што пройдзе час і ўжо нашы нашчадкі раскажуць аб тым, якім Чалавекам быў наш аднавясковец; і яны будуць так, як і я, ганарыцца людзьмі, якія стваралі гісторыю сваёй маленькай радзімы, упісваючы сваё імя ў святое імя Айчына.

## ГЛАВА 4. ГІСТОРЫЯ ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ

Сярод фотаздымкаў ветэранаў вайны ў музеі школы - здымак былога настаўніка нашай школы Тананка Івана Ануфрыевіча. У своеасаблівай галерэі на другім паверсе школы таксама размешчана шмат фотаздымкаў, на якіх Іван Ануфрыевіч разам з вучнямі. Мы ведаем, што ён быў майстрам на ўсе рукі, вынаходнікам, доўгі час выкладаў у школе асновы ваеннай падрыхтоўкі, працоўнае навучанне. Пасля ён часта прыходзіў на сустрэчы з вучнямі, заўсёды выступаў на мітынгах, прысвечаных Дню Перамогі, быў старшынёй мясцовага савета ветэранаў. У 2004 годзе Івана Ануфрыевіча не стала. Знаёмячыся з матэрыяламі музея пра франтавыя дарогі нашых землякоў, нам захацелася больш падрабязна даведацца пра ваенны і жыццёвы шлях Тананка І.А., якога часта ўспамінаюць добрым словам нашы настаўнікі, аднавяскоўцы, бацькі – яго былыя вучні.

Вучнямі ўстановы адукацыі запісаны ўспаміны ветэрана, аднак у экспазіцыі музея адсутнічалі асабістыя рэчы Івана Ануфрыевіча – сведкі Вялікай вайны. Таму летам 2020 года члены навуковага аб’яднання старшакласнікаў “Пошук” наведалі дачку ветэрана Алену Іванаўну, якая адпачывала ў гэты час у бацькоўскім доме. Алена Іванаўна ўспомніла, што бацька часта расказваў сваім дзецям, а потым і ўнукам пра тое, што адбывалася ў Луках у час нямецкай акупацыі.

Дачка расказала нам наступнае: “26 чэрвеня 1941 года бацька запомніў на ўсё жыццё. У гэты дзень ён разам з іншымі хлапчукамі пасвіў кароў. Пасля абеду з боку Міра паказалася калона машын – легкавушка і тры грузавікі, якія спыніліся у цэнтры вёскі. Гэта былі немцы. Пачалася трохгадовая акупацыя. “Новы парадак”, устаноўлены фашыстамі, нёс смерць, грабеж мірнага насельніцтва. У першыя ж дні акупацыі на ўскрайку вёскі фашысты расстралялі сям’ю яўрэяў. У 1942 годзе ў Мірскім раёне пачынае разгортвацца партызанская барацьба. Іван Ануфрыевіч наладжвае сувязь з партызанскім кавалерыйскім атрадам Дзянісенкі. Яшчэ з пачатку вайны падлетак пачаў збіраць зброю, якую захоўваў на гарышчы пад сенам. Аднойчы толькі цуд

ураtаваў Івана і яго сям'ю ад смерці. Нямецкія фуражыры нечакана з'явіліся ў вёсцы. Тры фашысты залезлі на гарышча і пачалі скідаць сена. Вытрымка не пакінула падлетка: ён узяў гарлачык вады і палез да фашыстаў. "Гут, гут", - заківалі галавамі варожыя салдаты і злезлі на зямлю. Іван пачаў скідваць сена сам. Ноччу з'явіліся партызаны - і небяспечная схованка трапіла па прызначэнні.

Летам 1943 года фашысты пачалі вывозіць моладзь у Германію на прымусовыя работы. У гэты спіс трапіў і бацька. З усяго раёна моладзь адправілі ў Мір і пешшу пагналі на чыгуначную станцыю ў Гарадзею.

У дарозе ён пазнаёміўся з чатырнаццацігадовай дзяўчынай Марыяй з Браносава, што ў васьмі кіламетрах ад родных Лук. Згаварыўшыся, яны, падабраўшы момант, кінуліся ў лес. Тры дні маладыя людзі дабіраліся дамоў, баючыся трапіць у рукі немцаў. Гэтая сустрэча знайшла сваё прадаўжэнне ў пасляваенны час. "Я адразу пазнала ў высокім малодшым сяржанце, які стаяў на парозе школы, таго хлопца, з якім разам уцякалі ад фашысцкай няволі", – успаміналa і Марыя Пятроўна, наша маці. У будучым яны сталі мужам і жонкай".

Алена Іванаўна была ўдзячна нам за тое, што ў школе беражліва захоўваецца памяць пра яе бацьку. Таму для школьнага музея яна падаравала нам сямейную рэліквію - запісную кніжку Івана Ануфрыевіча, якая была разам з ім у нялёгкія ваенныя дні.

А франтавыя дарогі Івана Ануфрыевіча пачаліся у ліпені 1944 года, адразу ж пасля вызвалення Беларусі, калі ён, малады дзевятнаццацігадовы юнак, быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. Навабранец быў накіраваны ў Гарахавецкі фарміровачны лагер. Пасля курса маладога байца далейшы шлях радавога Тананка прайшоў праз палкавую школу малодшых камандзіраў, пасля заканчэння якой яму было прысвоена званне малодшага сяржанта і воінская спецыяльнасць наводчык арудыя.

У снежні 1944 года у складзе 1109-га артылерыйскага знішчальнага супрацьтанкавага палка, трэцяй батарэі наводчыкам першага арудыя молодшы

сяржант Тананка І. А. трапіў на фронт. Полк уваходзіў у склад І-га Беларускага фронта, які вёў цяжкія баі на тэрыторыі Польшчы. Не адзін раз малады салдат быў на валасок ад смерці. На дапамогу прыходзілі вопытныя, абстраляныя аднапалчане, добрая фізічная падрыхтоўка і прыродная смякалка. Аднойчы, у самым пачатку новага 1945 года, па загаду камандзіра батарэі капітана Копцава малодшы сяржант Тананка разам са старшынёй Івашчанка і малодшым лейтэнантам Судаевым быў прызначаны ў разведку. Неабходна было перайсці лінію фронта, здабыць звесткі аб скапленні баявой тэхнікі ворага і схему размяшчэння агнявых кропак. Нейтральная паласа праходзіла праз рачулку шырынёй метраў 10-12. Стаяла адліга, лёд быў не вельмі моцны, а перапраўляцца трэба. У гэты момант батарэя правяла разведку боем. Начная цемра асвяцілася сполахамі узрываў, кулямётнымі чэргамі. Разведчыкі паспяхова выканалі заданне і нават захапілі “языка”. Толькі каля самага берага лёд пад Іванам Ануфрыевічам праваліўся. Разам з нямецкім обер-лейтэнантам ён апынуўся ў вадзе. На дапамогу прыйшлі таварышы. Уся група была прадстаўлена да дзяржаўных узнагарод: малодшы сяржант Тананка – да медаля “За адвагу”.

Цяжкія, крывавыя баі ішлі на захадзе Польшчы, каля горада Чанстахова. Фашысты любой цаной імкнуліся не дапусціць Чырвоную армію на тэрыторыю Германіі. Некалькі разоў вораг спрабаваў нанесці контрудар. Савецкія воіны неслі цяжкія страты. У адной з такіх контратак нямецкія танкі выйшлі на пазіцыю батарэі. Артылерысты панеслі вялікія страты. З шасці чалавек арудзійнага разліку малодшага сяржанта Тананка ў страі засталіся чатыры салдаты, з іх два лёгка параненых. Вакол разрываліся снарады, ад пастаянных выбухаў закладвала вушы. Удалым выстралам быў падбіты нямецкі “тыгр”. У гэты момант прамым пападаннем нямецкага снарада была выведзена со строю гармата, а Іван Ануфрыевіч быў кантужаны і паранены ў правы бок і адпраўлены ў медсанбат, адкуль яго накіроўваюць на лячэнне ў Горкаўскі цэнтральны ваенны шпіталь, дзе героя знайшла ўзнагарода за апошні бой – ордэн Чырвонай Зоркі. Лячэнне працягвалася амаль тры месяцы.

У шпіталі Іван Ануфрыевіч атрымліваў паштоўкі ад родных, землякоў і аднапалчан. Тут з’явіліся і новыя баявыя сябры, сувязь з якімі ён хацеў захаваць і надалей. Таму, акрыяўшы ад ран, малады салдат змайстраваў сабе невялічкую запісную кніжку, першымі запісамі ў якой сталі адрасы сяброў. [ДАДАТАК 3]. А даведаліся мы пра гісторыю ўзнікнення запісной кніжкі не з успамінаў Івана Ануфрыевіча, а расказала нам пра гэта яна сама. Вывучаючы запісную кіжку, мы  заўважылі, што спачатку вокладкай для яе паслужыла паштоўка, дасланая Івану Ануфрыевічу ў шпіталь 15 лютага 1945 года сябрам-земляком Курашом Іванам Фёдаравічам [ДАДАТАК 4]. На вокладцы захаваліся толькі рэшткі тэксту, а ў самой запісной кніжцы мы знайшлі поўны адрас гэтага чалавека [ДАДАТАК 5]. Акрамя таго, на старонкі гэтай кніжкі ён запісваў словы любімых песень, якія спявалі ў шпіталі [ДАДАТАК 6].

Салдат не развітваўся са сваёй запісной кніжкай да самай мабілізацыі, пакуль не вярнуўся дадому. А ваенная дарога не закончылася раненнем і шпіталем. Медыцынская камісія прызнала малодшага сяржанта годным для далейшага працягвання службы. Слых пасля кантузіі аднавіўся і мова стала нармальнай.

У канцы красавіка 1945 года Тананка І.А. зноў апынуўся ў Гарахавецкім фарміровачным лагеры. Там ён быў накіраваны для далейшай службы ў 2035 гаўбічны артылерыйскі полк (ГАП) 5-й механізаванай чырвоназнамённай ордэна Кутузава гвардзейскай дывізіі. Дывізія ў пачатку мая па чыгунцы следавала на Захад на фронт. Усе адчувалі блізкасць перамогі. У час шляху на фронт саставы абляцела радасная вестка – Перамога. “Радасць, слёзы ... Перадаць словамі ахапіўшыя нас пачуцці немагчыма. Усе стралаялі ўверх з усіх відаў стралковай зброі”, - так аб гэтым дні ўспамінаў Іван Ануфрыевіч на адной з сустрэч з вучнямі нашай школы. У Германіі Іван Ануфрыевіч служыў да кастрычніка 1945 года.  Затым 5-ая механізаваная дывізія была накіравана на Усход і ў снежні гэтага ж года апынулася ў Іране, каля горада Мішхед. Салдаты жылі ў палатках сярод іранскіх пяскоў. Нязвыклы клімат быў прычынай розных хвароб. Мусульманская краіна з іншымі звычаямі была не вельмі гасціннай. Усе

зносіны з мясцовым насельніцтвам былі забаронены. За сем месяцаў службы на поўначы Ірана толькі аднойчы Іван Ануфрыевіч пабыў у горадзе разам з іншымі салдатамі.

У канцы лета 1946 года 5-ая механізаваная дывізія была перадыслыкавана ў Савецкі Саюз, на тэрыторыю Туркменскай ССР, у горад Мары. Штаб дывізіі знаходзіўся ў цэнтры горада, а падраздзяленні размясціліся на ўскрайку. Спачатку жылі ў палатках і адначасова ўзводзілі будынкі, не спыняючы воінскую вучобу. Прыйшло маладое папаўнене, якое праходзіла падрыхтоўку ў палявых умовах. Сяржант Тананка ў гэты час быў прызначаны камандзірам аддзялення. Адказнасць ён нёс не толькі за сябе, але і за падначаленных. Воінская служба для Івана Ануфрыевіча закончылася ў канцы 1947 года, калі ён быў дэмабілізаваны. Больш чым месяц амаль праз усю краіну сяржант Тананка вяртаўся да роднага дому.

У час гэтых выпрабаванняў разам з ім была і запісная кніжка, у якую ён прадаўжаў запісваць словы любімых песень і адрасы новых сяброў. Відаць, што запісы зроблены ў розны час, таму што захаваліся па-рознаму і вяліся то алоўкам, то чарнілам. За два з паловай гады знасілася і парвалася вокладка-паштоўка. Таму дбайны і ўмелы гаспадар прыладзіў новую драўляную вокладку і зрабіў скураны пераплёт [ДАДАТАК 7].

Гэта ваенная рэліквія дае нам уяўленне не толькі пра салдацкія шляхі-дарогі – па ёй можна ўбачыць, наколькі папулярнымі былі ў час вайны вядомыя савецкія песні (што гучаць яшчэ і сёння), якія салдаты перакладвалі на свой лад. Мы ўзнавілі тэксты песень, занесеныя ў запісную кніжку [ДАДАТАК 9]. Узнавіўшы адрасы, занесеныя ў запісную кніжку [ДАДАТАК 9], мы даведаліся аб аднапалчанах Івана Ануфрыевіча, аб ваеннай біяграфіі нашага земляка - Кураша Івана Фёдаравіча. Адрас у запісной кніжцы дапамог нам звязацца з яго роднымі. Унук ветэрана паведаміў нам аб ваенных шляхах-дарогах свайго дзеда, аб яго пасляваенным жыцці. [ДАДАТАК 10].

Падарунак дачкі ветэрана заняў сваё ганаровае месца сярод экспанатаў школьнага музея.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Барацьба салдат, партызан і падпольшчыкаў унесла значны ўклад у Вялікую Перамогу. І складалася яна з намаганняў кожнага ўдзельніка гэтых падзей. Прыемна, што сярод кагорты мужных воінаў і партызан ёсць прозвішча нашага аднавяскоўца Уладзіміра Лаўрэнцьевіча Анікій і любімага вучнямі настаўніка Івана Ануфрыевіча Тананка. Уладзімір Лаўрэнцьевіч выжыў пасля крывапралітнай вайны, ён даў жыццё маёй любімай настаўніцы , а яна сёння вучыць сваіх вучняў той самай памяці, святой памяці…

Добры след у жыцці пакінуў пасля сябе ўдзельнік-ветэран Вялікай Айчыннай вайны, вынаходнік і настаўнік Тананка І.А. Да сённяшняга дня былыя вучні ўспамінаюць яго з цеплынёй. Круціцца ў двары альтанка, збудаваная майстрам, працуюць аэрасані і мінітрактар, свораныя вынаходнікам.

Многа невядомых старонак ваенных біяграфій ветэранаў раскрылі маўклівыя сведкі тых далёкіх падзей – экспанаты школьнага музея. Іх гісторыя – гэта гісторыя ваеннага і мірнага жыцця людзей, якім яны належалі.

Мы пацвердзілі гіпотэзу, вызначаную ў пачатку даследавання. Запісная кніжка франтавіка змяшчае ў сабе яшчэ многа неразгаданых тайнаў. Мы плануем з дапамогай узноўленых адрасоў звязацца з дзецьмі ці ўнукамі іншых аднапалчан гераічнага настаўніка і адкрыць новыя старонкі Вялікай вайны.

Вялікая Айчынная вайна – Вялікая Слава і Вялікая Трагедыя нашага народа. Ідзе няўмола наперад час, без дазволу пакідаюць нас сведкі той далёкай вайны. Але памяць не дае забыць..

Пакуль мы помнім пра іх - «яны жывыя». Страцім памяць – згубім старонкі сваёй гісторыі, згубім сябе як нацыя..

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Грычонак, Т.А. Партызанскія фарміравання Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941-ліпень 1944) / Т.А.Грычонак // Гродзенская праўда - 1984. - 23 мая. – С. 2
2. Кніга народнай славы // Краязнаўчы музей Лукскай школы. – МЛШ №174.
3. Мацко, А. Прыгод хапіла б на траіх / А.Мацко // Раённая газета "Полымя". – 1994. – 6 мая. – С.2.
4. Рылка, М.І . У Прынёманскіх лясах / М.І.Рылка // Гродзенская праўда. – 1976. – 8 мая. – С. 3.
5. Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Т.1. – Мінск: НІА, 2008 . – 218с.

**ДАДАТАК 1**






**ДАДАТАК 2**




Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

БССР

ПАСВЕДЧАННЕ № 041611

Анікій

Уладзімір Лаўрэнцьевіч

сапраўды ўдзельнічаў у партызанскім руху на Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 13 сакавіка 1944 г. па 11 ліпеня 1944 г. у якасці радавога партызана атрада імя М. І. Калініна брыгады „Камсамолец"

Старшыня выканкома Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў працоўных

Я. Н. Вырко

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

БССР

УДОСТОВЕРЕНИЕ № 041611

Аникий

Владимир Лаврентьевич

действительно участвовал в партизанском движении в Белоруссии в период Великой Отечественной войны с 13 марта 1944 г. по 11 июля 1944 г. в качестве рядового партизана отряда им. М. И. Калинина бригады „Комсомолец"

Председатель исполкома Кореличского районного Совета депутатов трудящихся

В. Н. Вырко

М. П. 22 мая 1981 г.

**ДАДАТАК 3**

**АПІСАННЕ ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ**

Самаробная запісная кніжка памерамі 8 на 10,5 см з драўлянымі пласцінкамі-вокладкамі, злучанымі паміж сабой палоскай скуры цёмна-карычневага колеру, прышытай да іх тоўстай суровай ніткай. У запісной кніжцы налічваецца каля 22 лісткоў паперы, пажаўцелай ад часу, спісанай дзе чарнілам, а дзе алоўкам. Да верхняй вокладкі прымацаваны скураны раменчык, які служыў зашчэпкай для кніжкі, на ніжняй вокладцы засталася адтуліна ад фіксуючага элемента, на які накладваўся гэты скураны раменчык. Драўляныя вокладкі маюць вышчарбіны, пачарнелі ад часу і доўгага карыстання. Старонкі жоўтага колеру, на некаторых ёсць плямы, краі няроўныя, надарваныя. Маюцца рэшткі ўнутранай вокладкі, зробленай з паштоўкі, на якой можна разабраць некаторыя словы і дату: 15. II.-4 (5).

У кніжцы запісаны тэксты песень і адрасы.



.



**ДАДАТАК 4**





**ДАДАТАК 5**



**ДАДАТАК 6**



[illegible] на свидание к [illegible]
[illegible]. А теперь Вы за одним,
Вы бьетесь толпою, безнадежно
в сердцах [illegible]
4) Еще годик войны и не стане
мужчин, что тебя так ласкали
и грели, и на сотню женщин будет
один, как то раньше десятки
[illegible]
5) [illegible] будет [illegible] все силь-
ней и сильней. Вы пройдете по
[illegible] штабу. А вам будут
давать по рецепту по грам 120
на каждую бабу
6) Ты поверь дорогая [illegible]
пора! В [illegible] вроде [illegible]
и с карточкой будешь стоять до
утра. [illegible] старая добиться
6) Снять курганы темные
Снять курганы темные [illegible]
[illegible]. [illegible] раз [illegible]
по степи родной. [illegible] Красный сокол
[illegible]



**ДАДАТАК 7**





## ДАДАТАК 8

## АДРАСЫ АДНАПАЛЧАН

Горьковская область,
район Выкса,
село Шиморское,
Кураш Иван

Краснодарский край.
Новокубанский район,
хутор Ковалевка,
Полешчук Л.Ф.

Могилевская область,
Горецкий район,
Поцелевский с/с,
д. Б.Морозово,
Кравцов Иван.

Полтавская область,
В.Крымковский район,
с. Землянки,
Мажора Николай Яковлевич

## ДАДАТАК 9
## СОЛДАТСКИЕ ПЕСНИ

### Белый платочек

Скромненький белый платочек
Виден в дали голубой.
Парень кудрявый, парень отважный
Ранен лежит под сосной.

Рана у парня большая,
Кровью стекает лежит.
Девушка в скромном белом платочке
Парню на помощь бежит.

Рану бинтом обвязала
И в лазарет отвела.
Милому парню, парню кудрявому
Жизнь на руках принесла.

В сердце запал тот платочек,
Белый платочек родной –
Парень красивый, парень кудрявый
Снова идет уже в бой.

А когда кончится битва,
И под зеленой сосной
С девушкой милой в белом платочке
Встретится парень-герой.

### Спят курганы тёмные

Спят курганы тёмные, битвой опалённые,
Дым пожаров стелется по степи родной.
Сизокрылым соколом в синеву высокую
Взвил на истребителе парень молодой.

Города, селения ждут освобождения,
Ждёт свободы девушка, ставшая рабой.
За обиды жгучие – ненависть кипучая,
На земле и в воздухе сердце рвётся в бой.

За огонь пожарища и за смерть товарища,
За обиду девушки русской и простой
Бьёт на истребителе немца-разорителя
Сын великой Родины – парень молодой.

**Черемуха**

Под окном черемуха колышется,
Осыпая листики свои.
Над рекой знакомый голос слышится
И поют всю ночку соловьи.

Сердце девичье забилось радостней:
Как хорошо, как весело в саду,
Жди меня, любимый и единственный,
В час ночной  к тебе я прибегу.

Под окном у дерева стояли мы,
И тихонько дождик моросил.
Навсегда друг с дружкою прощалися,
И тихонько ей я говорил:

«Ты не забудь меня, моя любимая,
Когда уеду я на страшную войну,
Мы с тобою, может, не увидимся,
И к тебе я больше не приду.

Ухожу я на войну тяжёлую
Победить проклятого врага.
Будем драться за страну родимую,
Будем немцев бить мы до конца».

## ДАДАТАК 10

## ВОСПОМИНАНИЯ ВНУКА КУРАША И.Ф.

Когда началась война, моему деду исполнилось всего семнадцать лет. Вместе с другом он попал на фронт, дописав год, чтобы быть старше. Служил в пехотной части. На войне он был несколько раз ранен. Последнее ранение оказалось чуть ли не смертельным. Их отряд обеспечивал переправу. Это было под городом Белостоком. Внезапно завязался бой с немцами. Для многих солдат он был последним. Прадед был ранен, потерял руку. В госпитале он познакомился с моей бабушкой Надеждой, которая работала там медсестрой. Потому после выздоровления он поехал с ней на ее родину. Но даже после госпиталя он оставался в рядах защитников Родины. Он пошёл на завод, чтобы помогать фронту.

После войны мой дед жил в посёлке Выкса Горьковской области. Семья у него была большая. Родилось у них три дочери: Валентина, Клавдия и Людмила. Валентина – моя мать, это она мне рассказала о своём отце, моём дедушке. Он очень любил детей, поэтому работал учителем начальных классов. Помогал ребятам становиться грамотными, открывал мир знаний, учил любить Родину. Он был не просто учителем, он был настоящим наставником для своих односельчан: к нему шли за советом, помощью, в которых он никогда никому не отказал. А еще это был очень честный и справедливый человек. Прадедушка очень любил свой поселок, любил лес, часто вместе со своими детьми он помогал зимующим птицам. Семья бабушки Нади была счастливой. Но беда пришла нежданно: в 1957 году не стало моего деда. Он погиб от рук браконьеров. Весть о его гибели с содроганием восприняли не только родные, но и все жители посёлка. Сегодня ему было бы 89 лет.